**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**
**Вучэбна-метадычнае аб’яднанне**
**па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў**

# БЕЛАРУСКАЯ І СУСВЕТНАЯ ЛІТАРАТУРА
## Раздзел І. БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

**Тыпавая вучэбная праграма**
для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці
1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2011

**Складальнікі:**

*В.С.Варапаева,* прафесар кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*Г.М.Друк,* дацэнт кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат філалагічных навук;

*Г.К.Тычко,* загадчык кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", доктар філалагічных навук, прафесар

**Рэцэнзенты:**

*кафедра* беларускай літаратуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М.Танка";

*А.І.Бельскі,* прафесар кафедры беларускай літаратуры і культуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар філалагічных навук, прафесар

**Рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці тыпавой:**

*кафедрай* беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 8 ад 06.04.2010 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 7 ад 08.06.2010 г.);

*навукова-метадычным* саветам па культуры, бібліятэказнаўстве і бібліяграфіі Вучэбна-метадычнага аб'яднання па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 6 ад 10.06.2010 г.)

Адказны за рэдакцыю *В.Б.Кудласевіч*
Адказны за выпуск *Г.К.Тычко*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма па раздзеле I “Беларуская літаратура” вучэбнай дысцыпліны “Беларуская і сусветная літаратура” распрацавана ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія.

Вывучэнне дадзенага раздзела прадугледжана па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках), акрамя напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-04 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (філалогія і лінгвістыка).

Курс беларускай літаратуры ў сістэме падрыхтоўкі работнікаў дадзенай галіны мае надзвычай важнае значэнне. За кошт пашырэння агульнагуманітарных ведаў студэнта паглыбляецца і ўдасканальваецца прафесійная падрыхтаванасць будучага спецыяліста. Праграма заснавана на канцэптуальным навуковым падыходзе да разумення гісторыі развіцця нацыянальнай літаратуры, адлюстраваным у тыпавой вучэбнай праграме для вышэйшых навучальных устаноў “Гісторыя беларускай літаратуры XX – пачатку XXI стагоддзя” (2006, пад навуковай рэдакцыяй праф. Т.І.Шамякінай і праф. А.І.Бельскага). Праграма складаецца з манаграфічных і аглядных раздзелаў і прадугледжвае разнастайныя формы навукова-даследчай працы, у тым ліку індывідуальныя заданні. Гісторыка-літаратурны кантэкст вывучэння айчыннай літаратуры дазваляе пашырыць эстэтычныя арыентацыі студэнтаў, актывізаваць іх прафесійныя навыкі, падрыхтаваць кваліфікаваных спецыялістаў у галіне нацыянальнай культуры і мастацтваў.

Істотнае значэнне ўдзяляецца непасрэдным кантактам нацыянальнай літаратуры з бібліятэказнаўчымі і бібліяграфічнымі дысцыплінамі, такімі як “Бібліятэказнаўства”, “Аналітыка-сінтэтычная апрацоўка дакументаў” і інш. У праграме ўлічана суаднесенасць беларускай літаратуры з сусветным кантэкстам. Такім чынам, за кошт пашырэння агульнагуманітарных ведаў студэнта паглыбляецца і ўдасканальваецца прафесійная падрыхтаванасць будучага спецыяліста.

*Мэты* курса:

– адлюстраванне складаных шляхоў фарміравання нацыянальнай мастацкай традыцыі і гісторыі развіцця нацыянальнай літаратуры XI–пачатку XXI ст.;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– вывучэнне агульных тэндэнцый развіцця літаратурнага працэсу і творчасці паасобных мастакоў;

– вызначэнне асаблівасцей развіцця, месца і ролі беларускай літаратуры ў сусветным літаратурным працэсе.

*Задачы:*

– засваенне навыкаў самастойнага гістарычна-параўнальнага аналізу твораў;

– разуменне крытэрыяў мастацкасці, неабходных для прафесійнай працы.

У выніку вывучэння курса студэнт павінен *ведаць*:

– месца і ролю мастацкай літаратуры ў культуралагічным кантэксце;

– спецыфіку мастацкай літаратуры як форму спасціжэння свету;

– сувязі і ўзаемаўплывы літаратуры з іншымі відамі мастацтва;

– творчасць яркіх прадстаўнікоў кожнай з мастацкіх эпох;

– літаратуру для дзяцей і юнацтва;

– прафесійную беларускамоўную лексіку.

Студэнт павінен *умець*:

– характарызаваць літаратурную эпоху і асноўныя этапы яе развіцця;

– вызначаць спецыфіку нацыянальнага літаратурнага працэсу;

– успрымаць літаратурны твор ва ўзаемасувязі гісторыі і сучаснасці;

– самастойна аналізаваць мастацкі твор і творчасць пісьменніка;

– выкарыстоўваць набытыя веды ў прафесійнай практыцы.

Пры вывучэнні раздзела "Беларуская літаратура" рэкамендуецца выкарыстоўваць сучасныя тэхналогіі навучання і прынцыпы кампаратывістычнага, культурна-гістарычнага, структурна-семантычнага і тыпалагічнага метадаў.

Вучэбная праграма дысцыпліны разлічана максімальна на 160 гадзін, у тым ліку 80 гадзін аўдыторных заняткаў. Прыкладнае размеркаванне гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 50 гадзін, семінары – 30 гадзін.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Колькасць гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лек. зан. | сем зан |
| ***Тэма 1.*** Літаратура XI–XVII стст. | 2 | 2 | |
| ***Тэма 2.*** Літаратура Адраджэння і Рэфармацыі | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 3.*** Літаратура XIX ст. Польска-беларускія пісьменнікі | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 4.*** Зараджэнне рэалістычнай плыні | 2 | 2 | |
| ***Тэма 5.*** Літаратура пачатку XX ст. | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 6.*** Максім Багдановіч (1891–1917) | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 7.*** Вацлаў Ластоўскі (1883–1938) | 2 | 2 | |
| ***Тэма 8.*** Алесь Гарун (Аляксандр Прушынскі, 1887–1920) | 2 | 2 | |
| ***Тэма 9.*** Янка Купала (Іван Луцэвіч, 1882–1942) | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 10.*** Якуб Колас (Канстанцін Міцкевіч, 1882–1956) | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 11.*** Максім Гарэцкі (1893–1938) | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 12.*** Літаратура 1930-х гг. Сацыяльна-гістарычныя ўмовы развіцця | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 13.*** Кандрат Крапіва (Кандрат Атраховіч, 1896–1991) | 2 | 2 | |
| ***Тэма 14.*** Кузьма Чорны (Мікалай Раманоўскі, 1900–1944) | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 15.*** Літаратура Заходняй Беларусі, перыяду Вялікай Айчыннай вайны і першага пасляваеннага дзесяцігоддзя | 6 | 4 | 2 |
| ***Тэма 16.*** Літаратура другой паловы 1950 – першай паловы 1980-х гадоў: асноўныя тэндэнцыі развіцця | 6 | 4 | 2 |
| ***Тэма 17.*** Беларуская “ваенна-вясковая” школа ў прозе | 6 | 4 | 2 |
| ***Тэма 18.*** Лірычная і гістарычная проза, драматургія | 4 | 2 | 2 |
| ***Тэма 19.*** “Філалагічнае” пакаленне ў беларускай паэзіі | 6 | 4 | 2 |
| ***Тэма 20.*** Беларуская літаратура на сучасным этапе | 6 | 4 | 2 |
| **Усяго…** | **80** | **50** | **30** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## *Тэма 1. Літаратура XI–XVII стст.*

Перыядызацыя і характарыстыка асноўных літаратурных эпох і этапаў развіцця беларускай літаратуры. Літаратура Беларусі XI – першай паловы XVI ст. Роля Кірылы і Мяфодзія ў яе станаўленні і развіцці. Мастацкі феномен “Слова аб паходзе Ігаравым”. Сувязь твора з гісторыяй, Беларуссю. Пераклады. Асветніцкая дзейнасць Ефрасінні Полацкай. Мастацкія асаблівасці “Жыція Ефрасінні Полацкай”. Зараджэнне асноўных перакладных і арыгінальных жанраў пісьмовай літаратуры. “Словы” Кірылы Тураўскага і іх мастацкія вартасці. Агіяграфічная літаратура і яе сутнасць. Віды агіяграфічнай літаратуры. Старажытныя апокрыфы, іх распаўсюджанне і фальклярызацыя ў Беларусі. Літаратура XIV – пачатку XVII ст. Узнікненне беларускага летапісу, яго асаблівасці (хронікі Быхаўца, Баркалабаўская хроніка). Выкарыстанне летапісных сюжэтаў у літаратуры XIX–XX стст. (А.Міцкевіч, Ю.Нямцэвіч, Я.Купала, Ул.Караткевіч, А.Дудараў, В.Іпатава, А.Петрашкевіч і інш.).

## *Тэма 2. Літаратура Адраджэння і Рэфармацыі*

*Ян Вісліцкі* (каля 1485 – пасля 1520) і яго літаратурная спадчына. *Мікола Гусоўскі* (1480(?) – пасля 1533). “Песня пра зубра” (1523) – маштабнасць і агульначалавечая значнасць твора, нацыянальна-беларускі каларыт. *Францыск Скарына* (каля 1480 – каля 1551). Старонкі жыцця і дзейнасці. Гісторыка-культурнае значэнне постаці Ф.Скарыны. Вобраз Скарыны ў мастацтве, музыцы, літаратуры. Літаратура XVI–XVIII стст. Рэфармацыя і яе роля ў развіцці пісьменства. Скарынінскія традыцыі ў культурна-асветніцкай дзейнасці *Сымона Буднага* (каля 1530–1593) і *Васіля Цяпінскага* (каля 1540 – каля 1603). Зараджэнне і развіццё рэлігійна-палемічнай літаратуры ў Беларусі пасля Люблінскай і Берасцейскай уній. Роля палемічнай літаратуры ў зараджэнні новых жанравых формаў старажытнай беларускай прозы (“Прамова Мялешкі”, 1589, “Ліст да Абуховіча”, 1665, “Лісты Ф.Кміты-Чарнабыльскага”, “Дзённік Ф.Еўлашэўскага” і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Зараджэнне беларускай сілабічнай паэзіі. Дзейнасць *А.Рымшы* (каля 1550 – каля 1599) і *С.Полацкага* (1629–1680). Перакладная старабеларуская проза. Гістарычныя хронікі. Літаратура эпохі заняпаду старабеларускага пісьменства (2-я палова XVII–XVIII ст.). Ананімны характар мастацкай творчасці. Інтэрмедыі і беларуская батлейка.

### *Тэма 3. Літаратура XIX ст.*
### *Польска-беларускія пісьменнікі*

Агульная характарыстыка беларускай літаратуры XIX ст. Асаблівасці зараджэння новай беларускай літаратуры ў кантэксце развіцця тагачасных славянскіх літаратур. Ананімная літаратура і яе значэнне.

*Польска-беларускія пісьменнікі.* Гістарычная абумоўленасць літаратурнага двухмоўʼя. Роля філамацкага руху, польскай рамантычнай паэзіі і паўстанняў 1830, 1863 гг. у станаўленні новай беларускай літаратуры. *Ян Чачот* (1796–1847) – асоба і творца. Гуманістычны пафас, дэмакратычная накіраванасць і культурна-асветніцкае значэнне яго творчай дзейнасці (“Да мілых мужычкоў”, “На прыезд Адама Міцкевіча”, балады “Свіцязь”, “Наваградскі замак”).

*Адам Міцкевіч* (1798–1855). Выкарыстанне беларускага фальклору ў зборніку “Балады і рамансы” (балады “Свіцязь”, “Рыбка” і інш.). Прывабны вобраз рамантычнага героя-змагара за шчасце і свабоду Літвы-Беларусі (“Ода да маладосці”, “Паэма філарэтаў”, паэмы “Мешка, князь Наваградка”, “Гражына”). Творчасць перыяду ссылкі і эміграцыі (“Крымскія санеты”, “Конрад Валенрод”, “Дзяды”). А.Міцкевіч і А.Пушкін. Творчая палеміка. “Пан Тадэвуш” як нацыянальная эпапея. Пераклады твораў А.Міцкевіча на беларускую мову.

Творчасць *Яна Баршчэўскага* (1792/94) – 1851). Вершы на беларускай мове (“Дзеванька”, “Гарэліца”, “Бунт хлопаў”). Апрацоўка беларускіх легенд і паданняў (балады “Русалка-спакусніца”, “Дзве бярозы”, “Зарослае возера” і інш.). Тэма Бацькаўшчыны, паказ трагічных чалавечых лёсаў у кнізе ”Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”.

*Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч* (1807–1884). Гуманістычны пафас ранніх твораў В.Дуніна-Марцінкевіча (“Сялянка”, 1846). Вершаваныя аповесці “Вечарніцы”, “Купала”, “Гапон” (1859).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рамантычны этнаграфізм як аснова творчага метаду В.Дуніна-Марцінкевіча. Паглыбленне крытычных элементаў у баладзе “Травіца брат-сястрыца” і вершаваных аповесцях “Быліцы, расказы Навума”, “Халімон на каранацыі”. Драматургічная спадчына В.Дуніна-Марцінкевіча. Сатырычна-выкрывальны пафас “Пінскай шляхты” (1866) і “Залётаў” (1870). Кручкоў і Пісулькін як увасабленне чыноўніцкага самавольства пасля паўстання 1863 г. Ліра-эпічныя творы В.Дуніна-Марцінкевіча на польскай мове (“Славяне ў XIX стагоддзі”, “Люцынка, альбо шведы на Літве”, “Літаратурныя клопаты”), іх гісторыка-мастацкае значэнне.

### *Тэма 4. Зараджэнне рэалістычнай плыні*

Верш *П.Багрыма* (1813–1890) “Зайграй, зайграй, хлопча малы”. Драматызм жыццёвага лёсу *Ф.Савіча* (1815–1845). “Дзе тое шчасце падзелася” і “Споведзь”. Патрыятычны пафас і гуманістычны змест. Грамадска-палітычная атмасфера ў Беларусі канца 1950 – пачатку 1960-х гг. Кансалідацыя перадавых сіл вакол “Мужыцкай праўды” *К.Каліноўскага* (1838–1864). Публіцыстыка “Мужыцкай праўды” і рост нацыянальна-патрыятычнай самасвядомасці. Літаратурна-публіцыстычная спадчына К.Каліноўскага (“Пісьмо з-пад шыбеніцы”, “Марыська, чарнабровая галубка мая…”).

*Францішак Багушэвіч* (1840–1900). Уплыў паўстання 1863 г. на фарміраванне ідэйна-эстэтычных поглядаў Ф.Багушэвіча. Грамадска-публіцыстычная дзейнасць пісьменніка ў Вільні. Сяброўства з Э.Ажэшка і Я.Карловічам. Зборнік “Дудка беларуская” (1892). Патрыятычная накіраванасць “Прадмовы”. Праблема мастака і народа (“Мая дудка”). Матывы сацыяльнага пратэсту (“Дурны мужык, як варона”, “Бог не роўна дзеле”, “Думка” і інш.). Выкрыццё царскага суда і чыноўніцтва (“У астрозе”, “У судзе”, “Як праўды шукаюць”). Жанр баллады (“Быў у чыстцы”, “Балада”), вершаванага апавядання і аповесці (“Хрэсьбіны Мацюка”, “Кепска будзе”). Асаблівасці рэалізму Ф.Багушэвіча. Зборнік “Смык беларускі” (1894). Маральна-этычны і філасофскі змест цыкла “Песні”, своеасаблівасць яго паэтычнай будовы. Байкі Ф.Багушэвіча (“Воўк і авечка”, “Свіння і жалуды”).

Ф.Багушэвіч як адзін з заснавальнікаў беларускай прозы (“Сведка”, “Палясоўшчык”, “Дзядзіна”, “Тралялёначка”).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Сучаснікі і паслядоўнікі Ф.Багушэвіча*. Паэтычная творчасць *Я.Лучыны* (1851–1897). Дэмакратычная накіраванасць і патрыятычны пафас (“Родная старонка”, “Што думае Янка, везучы дровы ў горад”, “Сівер”, “Вясна”, “Паляўнічыя акварэлькі з Палесся”). Мемуарная спадчына Я.Лучыны (“З крывавых дзён”). Перакладчыцкая дзейнасць. Паэтычная творчасць *А.Гурыновіча* (1869–1894), яе дэмакратычная накіраванасць і патрыятычны змест (“Дзякуй табе, браце, Бурачок Мацею”, “Перш душылі паны…”, “Бор” і інш.).

### *Тэма 5. Літаратура пачатку XX ст.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Грамадска-палітычныя і сацыяльна-гістарычныя ўмовы развіцця беларускай літаратуры пачатку XX ст. Удзел пісьменнікаў (Цётка, Я.Купала, Я.Колас, М.Багдановіч, А.Гарун, В.Ластоўскі, М.Гарэцкі, З.Бядуля і інш.) у грамадска-культурным руху пачатку XX ст. Газеты “Наша доля” і “Наша Ніва”, кансалідацыя творчых сіл на платформе “нашаніўства”. “Паскоранасць” літаратурнага працэсу. Развіццё лірычнай паэзіі, зараджэнне нацыянальнага ліра-эпасу, станаўленне прозы і драматургіі, крытыкі і публіцыстыкі, перакладчыцкай справы. Жанрава-стылявое ўзбагачэнне літаратуры. Творчасць *Ядвігіна Ш.* (Антон Лявіцкі, 1869–1922), *Сяргея Палуяна* (1890–1910), *Антона Навіны* (Антон Луцкевіч, 1884–1946?) і інш. Культурна-асветніцкая праца *Б.Эпімах-Шыпілы* (1859–1934). Навуковая дзейнасць акадэміка *Я.Карскага* (1861–1931), значэнне яго працы “Беларусы” ў асэнсаванні культурных аспектаў жыцця беларускага народа. Арганізацыя бібліятэк, гурткоў мастацкай самадзейнасці, тэатральных калектываў (І.Буйніцкі, Ф.Ждановіч, У.Галубок і інш.).

Сацыяльна-палітычныя абставіны на Беларусі ў 1917–1920 гг. Палітыка беларусізацыі і яе складаны шлях. Заснаванне Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1922), Інстытута беларускай культуры (Інбелкульт, 1922), Акадэміі навук БССР (1929), адкрыццё БДТ-1 і БДТ-2 (тэатры Я.Купалы і Я.Коласа, 1920), Дзяржаўнай публічнай бібліятэкі (1924) і інш. Значэнне гэтых падзей для развіцця беларускай літаратуры і культуры.

*Цётка* (Алаіза Пашкевіч, 1876–1916). Наватарства паэтычных вобразаў і ідэй у творах перыяду першай рускай рэ-

валюцыі (“Хрэст на свабоду”, “Мора”, “Вера беларуса”, “Суседзям у няволі” і інш.). Цётка як заснавальніца публіцыстычных жанраў у беларускай паэзіі пачатку XX ст. (маштабнасць вобразаў, экспрэсіўнасць). Гуманістычная скіраванасць і псіхалагізм прозы і публіцыстыкі Цёткі (“Прысяга над крывавымі разорамі”, “Асеннія лісты”, “Міхаська”, “Зваротлівы” і інш.). Цётка і развіццё народнай асветы і культуры.

## *Тэма 6. Максім Багдановіч (1891–1917)*

Роля сям’і ў фарміраванні светапогляду і творчых зацікаўленасцей. Эстэтычныя погляды М.Багдановіча (“Музыка”, “Апокрыф”, “Песняру”, “Псалтыр”). Зборнік “Вянок” (1913). Міфалагічныя і народнапесенныя тэмы і матывы. Праблема гістарычнай памяці народа, гуманістычны і патрыятычны пафас лірыкі паэта (“Пагоня”, “Беларусь, твой народ дачакаецца”, “Дось ужо чужынцам служылі”, “Як Базыль у паходзе канаў”). Героіка-рамантычныя паэмы “Максім і Магдалена” (1915) і “Страцім-лебедзь” (1916). Праблематыка, сістэма паэтычнай вобразнасці, народнапесенная стылістыка. М.Багдановіч як стылізатар беларускага верша (“Вершы беларускага складу”, цыкл “На ціхім Дунаі”). Абгрунтаванне перспектыўнасці творчай канцэпцыі паэта (артыкул “Забыты шлях”, 1915). Перакладчыцкая дзейнасць. М.Багдановіч як крытык і гісторык літаратуры. Вобраз М.Багдановіча ў беларускім мастацтве, музыцы, кіно.

## *Тэма 7. Вацлаў Ластоўскі (1883–1938)*

Шматграннасць творчай асобы В.Ластоўскага. Грамадска-палітычная, рэдактарска-выдавецкая дзейнасць. Ідэйна-творчыя ўстаноўкі В.Ластоўскага (артыкулы “Па сваім шляху”, “Сплачвайце доўг”). Празаічныя творы Власта, іх жанравая разнастайнасць (легенды, імпрэсіі, абразкі, апавяданні, аповесці). Аповесць “Лабірынты”, мнагаслойнасць вобразнавыяўленчай палітры. Рэальнае і фантастычнае ў творы. Інтэлектуалізм і філасафічнасць як вызначальныя рысы празаічных і паэтычных твораў пісьменніка. Уклад В.Ластоўскага ў развіццё беларускай навукі і культуры (часопіс “Крывіч”, “Расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік”, “Кароткая гісторыя Беларусі”, “Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі” і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 8. Алесь Гарун (Аляксандр Прушынскі, 1887–1920)*

Адраджэнне Беларусі – лейтматыў паэзіі А.Гаруна. Вобраз выгнанца-рэвалюцыянера і Радзіма ў творах. Прыродаапісальная, інтымная лірыка паэта (“Мая люба”, “Дзяўчаці”, “Навокал”, “Упрыпар”, “Восень”, “Вясна”, “Завіруха”) і іншыя вершы. Філасофская лірыка, развагі пра сэнс жыцця, месца чалавека ў Сусвеце, яго прызначэнне (“Як ліст вярбінкі маладой”, “Ідуць гады”, “Навука”, “Адбітак”, “Думкі-дыяменты”). Паэтычнае майстэрства А.Гаруна. Проза (апавяданні “Першы снег”, “Маладое”, “Пан Шабуневіч”, “Свята” і інш.): структура, ідэйна-мастацкі змест, вобразы.

### *Тэма 9. Янка Купала (Іван Луцэвіч, 1882–1942)*

Ранні перыяд творчасці. Зборнікі “Жалейка”, “Гусляр”, “Шляхам жыцця”. Літаратурна-творчая і грамадская дзейнасць Я.Купалы ў гады грамадзянскай вайны і акупацыі Беларусі (1917–1920). Зборнік “Спадчына”, яго праблематыка, агульны пафас. Сацыяльна-філасофская, нацыянальна-патрыятычная, інтымная, пейзажная лірыка Я.Купалы. Асаблівасці твораў канца 1920 – пачатку 1930-х гг. (“Сыходзіш, вёска, з яснай явы”, “Дзе крыўда адвечная спела…” і інш.). Паэмы Я.Купалы (“Адвечнае”, “Зімою”, “На куццю”, “Адплата кахання”, “Нікому”, “Яна і я”, “Тарасова доля”). Тэма Бацькаўшчыны ў паэмах “Адвечная песня”, “Сон на кургане”, “Безназоўнае”. Драматургія Я.Купалы (“Прымакі”, “Паўлінка”, “Раскіданае гняздо”). П’еса “Тутэйшыя” – канцэпцыя “тутэйшасці”. Перакладчыцкая дзейнасць. Роля Я.Купалы як прарока нацыі ў гісторыі беларускай літаратуры, развіцці нацыянальнай духоўнай культуры, музыкі, тэатра, мастацтва. Спадчына Купалы ў асвятленні сучасных крытыкаў, літаратуразнаўцаў і культуролагаў.

### *Тэма 10. Якуб Колас (Канстанцін Міцкевіч, 1882–1956)*

Ранні перыяд творчасці. Зборнік “Песні жальбы”. Асэнсаванне Я.Коласам падзей вайны і рэвалюцыі. Зборнік “Казкі жыцця” (1921), яго маральна-этычная і філасофская накірава-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насць, сувязь з гістарычным лёсам беларускага народа (“Проціў вады”, “Крыніца”, “Гусі” і інш.). Паглыбленне грамадзянскіх матываў у зборніку “Водгулле” (1922). Праблематыка ранніх апавяданняў пачатку 1920-х гг. (“Сяргей Карага”, “Крывавы вір”, “Дачакаўся”), іх навізна і актуальнасць, прыёмы псіхалагічнага раскрыцця вобразаў. Творчая праца Я.Коласа над паэмамі “Новая зямля” (1923) і “Сымон-музыка” (1925). Роля сатыры і гумару, арыгінальнасць рытміка-інтанацыйнай структуры. Трылогія “На ростанях” (“У палескай глушы”, 1922, “У глыбі Палесся”, 1927, “На ростанях”, 1954). Біяграфічная падаснова рамана і яе ўплыў на вобразную структуру твора. Інтэлігенцыя і народ у рамане. Рэгіянальны сацыяльна-псіхалагічны і этнаграфічна-бытавы каларыт у рамане.

### *Тэма 11. Максім Гарэцкі (1893–1938)*

Трагізм жыццёвага лёсу. Характарыстыка асноўных этапаў творчасці. М.Гарэцкі як прадстаўнік інтэлектуальна-філасофскай прозы. Паглыбленне ў сутнасць нацыянальнага менталітэту, пошукі “патаемнага” як спроба нацыянальнай самаідэнтыфікацыі. Тэма інтэлігенцыі і народа ў ранніх творах (“Роднае карэнне”, “У лазні”, “Што яно?”). Распрацоўка гістарычнай тэматыкі (“Лірныя спевы”). Драматызаваная аповесць “Антон” (1914). Жанравая адметнасць і маральна-філасофскі змест твора. Наватарства Гарэцкага ў выкарыстанні дакументалізму, спалучэнні структурных і стылявых пачаткаў эпасу і драмы. Ідэйная сутнасць сцэны “У славянскай кафейні”. Палемічная завостранасць вобразаў твора. Перыяд вайны і рэвалюцыі (1914–1918 гг.). Гуманістычны пафас і паглыбленне аб’ектывізаванай манеры пісьма ў творах “Літоўскі хутарок”, “Генерал”. Уключанасць твораў М.Гарэцкага ў сусветную плынь літаратуры страчанага пакалення (Э.М.Рэмарк, Э.Хэмінгуэй, А.Барбюс і інш.). Дакументальна-мастацкія запіскі “На імперыялістычнай вайне”. Сінтэз агульначалавечага і нацыянальнага ў творы. Аповесць “Дзве душы” (1919) – віленскі перыяд творчасці празаіка. Шматузроўневасць твора, яго жанравая спецыфіка: спалучэнне рэалізму і элементаў дэтэктыва, публіцыстычнасці і дакументалізму. Аповесці “Меланхолія”, “Ціхая плынь” – праўдзівасць, мас-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тацкая дасканаласць жанру. Творчая гісторыя рамана-хронікі “Віленскія камунары”. Маштабнасць задумы эпапеі пра лёс сялянства ў XIX і XX стст. у “Камароўскай хроніцы”.

### *Тэма 12. Літаратура 1930-х гг. Сацыяльна-гістарычныя ўмовы развіцця*

Звужэнне праблемна-эстэтычных пошукаў, схематычнае супастаўленне мінулага і сучаснасці (сярэдзіна 1930-х гг.). Разгром беларускай пісьменніцкай арганізацыі, рэпрэсіі ў дачыненні да творцаў. *Платон Галавач* (1903–1937). Матывы творчасці. Кнігі “Спалох на загонах” (1930), “Праз гады” (1935), “Носьбіты нянавісці” (1936), “Яны не пройдуць” (1937). *Уладзіслаў Галубок* (1882–1937). П’есы “Ганка”, “Пан Сурынта”, “Душагубы”, “Суд”, “Пісаравы імяніны” і інш. Праблематыка, вобразна-выяўленчыя сродкі. *Уладзімір Дубоўка* (1900–1976). Паэтычныя зборнікі “Строма” (1925), “Credo“ (1926), “Наля” (1927), “Палеская рапсодыя” (1961). Тэматыка, вобразнасць. Паэмы “Там, дзе кіпарысы”, “І пурпуровых ветразяў узвівы”. Высокая паэтычная культура, гуманістычны пафас. *Уладзімір Жылка* (1900–1933). Зборнікі “Вершы” (1970), “Пожні” (1986). Ідэйна-эстэтычныя пошукі, своеасаблівасць выяўленчай палітры. *Лукаш Калюга* (1909–1937). Аповесці “Ні госць, ні гаспадар” (1928), “Нядоля Заблоцкіх” (1931), незавершаны раман “Пустадомкі”. Жанрава-стылявыя асаблівасці і вобразна-выяўленчыя сродкі прозы. *Андрэй Мрый* (Андрэй Шашалевіч, 1893–1943). Сатырычны раман “Запіскі Самсона Самасуя” (1929). Праблематыка. Стылёва-жанравыя асаблівасці. Асаблівасці мовы. Месца твора ў гісторыі беларускай літаратуры.

*Змітрок Бядуля* (Самуіл Плаўнік, 1886–1941). Зборнікі “Абразкі” (1913), “На зачараваных гонях” (1923). Багатая падзейная аснова твораў, паглыблены псіхалагізм, мяккі гумар як адметныя рысы Бядулі-апавядальніка (“Летапісцы”, “Умарыўся”, “Сон Анупрэя”, “Злодзей” і інш.). Тэма мастака і мастацтва ў творчасці З.Бядулі (апавяданні “Велікодныя яйкі”, “Бондар”, вершы “На горне душы першы верш я каваў…”, “Гусляр”, “Мары паэта”, аповесць “Салавей”). Аўтабіяграфічныя творы (“Набліжэнне”, 1935), “У дрымучых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лясах", 1939). З.Бядуля-публіцыст, літаратурны і тэатральны крытык, дзіцячы пісьменнік.

*Міхась Зарэцкі* (Міхась Касянкоў, 1901–1937). Аналіз апавяданняў з ранніх зборнікаў ("У віры жыцця", 1925, "Пела вясна", 1925, "Пад сонцам", 1926 і інш.). Майстэрства драматычнага канфлікту, уменне будаваць цікавы сюжэт. Вобразы жанчын у творчасці М.Зарэцкага ("Дзіўная", "Кветка пажоўклая", "Бель"). Майстэрства Зарэцкага-раманіста. Значэнне раманаў "Вязьмо", "Сцежкі-дарожкі" ў выпрацоўцы нацыянальных эпічных традыцый. Асаблівасці мовы і мастацкага стылю пісьменніка.

### *Тэма 13. Кандрат Крапіва (Кандрат Атраховіч, 1896–1991)*

Удзел у літаратурных арганізацыях "Маладняк", "Узвышша". Тэматычны дыяпазон сатырычна-гумарыстычных вершаў і баек ранняга перыяду творчасці. К.Крапіва-празаік. Зборнік апавяданняў "Людзі-суседзі", раман "Мядзведзічы". Гуманістычна-сатырычная аснова прозы К.Крапівы. Першая п'еса "Канец дружбы" (1934). Псіхалагізм твора, схематызм канфлікту. Камедыя "Хто смяецца апошнім?" у тэатральнай культуры Беларусі. Творчасць К.Крапівы ў гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны перыяд. Праблематыка п'есы "Мілы чалавек" (1945). Сацыяльна-філасофская драма "Брама неўміручасці" (1973). Ідэйны змест і жанравыя асаблівасці. Роля К.Крапівы ў развіцці нацыянальнай драматургіі.

### *Тэма 14. Кузьма Чорны (Мікалай Раманоўскі, 1900–1944)*

Характарыстыка апавяданняў са зборнікаў "Апавяданні", "Срэбра жыцця" (1925), "Па дарозе", "Хвоі гавораць", "Пачуцці" (1926), "Верасьнёвыя ночы" (1929). К.Чорны-раманіст. Раман "Зямля" (1927). Праблема інтэлігенцыі і народа ў рамане "Сястра" (1928). Гуманістычны пафас твора. Сацыяльна-гістарычная аснова рамана "Бацькаўшчына", шматграннасць праблематыкі. Эпічныя творы К.Чорнага ваеннага часу – раманы "Пошукі будучыні", "Млечны шлях", "Вялікі дзень" і аповесць "Скіп'еўскі лес". Традыцыі сацыяльна-філасофскай прозы К.Чорнага ў развіцці сучаснай беларускай літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Тэма 15. Літаратура Заходняй Беларусі, перыяду Вялікай Айчыннай вайны і першага пасляваеннага дзесяцігоддзя*

*Літаратура Заходняй Беларусі.*

Заходнебеларускі друк і яго роля ў развіцці літаратурнага працэсу (“Беларускія ведамасці”, “Беларускае жыццё”, “Звон”, “Калоссе”, “Нёман” і інш.). Дзейнасць Грамады, ТБШ і іншых беларускіх нацыянальных арганізацый. Тэатральнае мастацтва як адзін са сродкаў прапаганды нацыянальнай ідэі. Тэма ўз’яднання народа ў творчасці заходнебеларускіх пісьменнікаў. Літаратурна-філасофскае эсэ І.Канчэўскага (І.Абдзіраловіча) “Адвечным шляхам”. Паэма Л.Родзевіча “Беларусь”. Феномен “самадзейнай” паэзіі. Зборнікі паэзіі У.Дубоўкі, У.Жылкі, Н.Арсенневай, М.Машары, М.Васілька, выдадзеныя ў Заходняй Беларусі. Роля паэзіі М.Танка ў развіцці літаратуры 1930-х гг. Разнастайнасць мастацка-эстэтычных плыняў у заходнебеларускай літаратуры (творчасць К.Сваяка, П.Пестрака, В.Таўлая і інш.). Публіцыстыка А.Луцкевіча, Б.Тарашкевіча, А.Смоліча, М.Гарэцкага, А.Цьвікевіча і інш.). Роля заходнебеларускай літаратуры ў культурным жыцці Беларусі.

*Максім Танк* (Яўген Скурко, 1912–1995). Удзел у нацыянальна-вызваленчай барацьбе Заходняй Беларусі. Першы зборнік паэзіі “На этапах” (1936) і яго мастацкія асаблівасці. Пашырэнне ідэйна-тэматычнага дыяпазону паэта ў зборніках “Журавінавы цвет”, “Пад мачтай”. Эстэтычныя пошукі ў давераснёўскай творчасці М.Танка (паэмы “Кастусь Каліноўскі”, “Нарач”, “Сказ пра Вяля”, “Казка пра музыку”). Паэзія М.Танка перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Характарыстыка пасляваенных зборнікаў “Каб ведалі”, “На камні, жалезе і золаце”, “У дарозе”. Паэма “Люцыян Таполя”. Праблема народнасці мастацтва. Паглыбленне гуманістычных тэндэнцый і філасафічнасці ў зборніках “След бліскавіцы”, “Мой хлеб надзённы”, “Глыток вады”, “Перапіска з зямлёй”, “Хай будзе святло”, “Дарога, закалыханая жытам”, “Нарачанскія сосны”. Лірычнае і публіцыстычнае ў паэзіі М.Танка 1980–1990-х гг. (зборнікі “Лірыка”, “Мой каўчэг”, “Errata”). Майстэрства М.Танка-перакладчыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ

*Літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны і першага пасляваеннага дзесяцігоддзя* (1941–1956).

Роля друку ў гады вайны. Асноўная праблематыка і жанравая спецыфіка літаратуры гэтага часу. Гераіка-патрыятычныя творы Я.Купалы, Я.Коласа, К.Крапівы, П.Броўкі, А.Куляшова, М.Танка, П.Панчанкі і інш. Элементы павярхоўнага падыходу і аднабаковага адлюстравання падзей вайны. Публіцыстыка, нарысы і апавяданні ваеннага часу М.Лынькова, Я.Коласа, К.Чорнага, А.Якімовіча, М.Лупсякова, Хв.Шынклера і інш. Драма К.Крапівы “Проба агнём”.

Асаблівасці беларускай літаратуры першага пасляваеннага дзесяцігоддзя. Адмоўныя з’явы ў грамадскай атмасферы і іх уплыў на літаратурны працэс. “Тэорыя бесканфліктнасці”, яе сутнасць і вытокі. Пачатак істотных перамен у грамадскім жыцці ў канцы першага пасляваеннага дзесяцігоддзя. Гуманістычны пафас, паэтызацыя гераізму і мірнай працы людзей у паэзіі (творы Я.Коласа, А.Куляшова, М.Танка, П.Панчанкі, М.Лужаніна, П.Броўкі, А.Бачылы). Выкрывальная сіла сатырычнай камедыі К.Крапівы “Мілы чалавек”. Недахопы тагачаснай драматургіі. Уплыў твораў дакументальна-мемуарнай літаратуры на мастацкую прозу (творы Я.Коласа, Я.Брыля, П.Пестрака, А.Чарнышэвіча, Б.Мікуліча).

## *Тэма 16. Літаратура другой паловы 1950 – першай паловы 1980-х гадоў: асноўныя тэндэнцыі развіцця*

Асуджэнне культу асобы на ХХ з’ездзе КПСС (1954 г.). Рэабілітацыя спадчыны рэпрэсіраваных беларускіх пісьменнікаў. Прыход у літаратуру прадстаўнікоў “філалагічнага” пакалення (У.Караткевіч, Р.Барадулін, Н.Гілевіч, Г.Бураўкін, А.Вярцінскі, С.Гаўрусёў, Б.Сачанка, В.Адамчык, І.Пташнікаў, І.Чыгрынаў, А.Грачанікаў і інш.). Актывізацыя літаратуразнаўства і літаратурнай крытыкі (кнігі А.Адамовіча, Р.Бярозкіна, В.Каваленкі, Ул.Калесніка, А.Лойкі і інш.). Тэматычная разнастайнасць, заглыбленасць, філасафічнасць грамадзянскай лірыкі паэтаў старэйшага пакалення (П.Броўкі, М.Лужаніна, Ул.Дубоўкі, А.Вялюгіна і інш.). Багацце творчых індывідуальнасцей у лірыцы 1960–1990-х гг. *Аляксей Пысін* (1920–1981). Кнігі паэзіі “Сонечная паводка”, “Мае мерыдыяны”, “Твае далоні”, “Ёсць на свеце мой алень”. Філасофскі роздум і пранікненне ў духоўны свет чалавека.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Аркадзь Куляшоў* (1914–1978). Першыя зборнікі “Росквіт зямлі”, “Медзі дождж”, “Па песню, па сонца”. Цыклы вершаў “Сонечнае заўтра” і “Юнацкі свет”. Паэмы А.Куляшова даваеннага часу (1931–1940-х гг.) – “Крыўда”, “Гарбун” (“Антон Шандыбала”), “У зялёнай дуброве”, “Хлопцы апошняй вайны” і інш. Іх грамадзянска-патрыятычная накіраванасць. Вершы і балады перыяду вайны. Паэмы “Сцяг брыгады”, “Прыгоды цымбал” і інш. Пашырэнне гуманістычнага пафасу ў філасофскай лірыцы А.Куляшова канца 1950–1960-х гг. (“Новая кніга”). Традыцыйны характар цыкла вершаў “Маналог”. Паглыбленне філасофскіх і інтэлектуальных пачаткаў у паэмах “Цунамі” і “Далёка да акіяна”. Лірыка-маналагічны стыль паэмы “Варшаўскі шлях”. Тэматычная і жанравая навізна драматычнай паэмы “Хамуціус”. Вобраз Кастуся Каліноўскага.

*Пімен Панчанка* (1917–1995). Матывы ранняй лірыкі (зборнік “Упэўненасць”, 1938). Паэзія П.Панчанкі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Вобраз лірычнага героя. Аўтабіяграфічнасць твораў П.Панчанкі. Гісторыя напісання цыкла вершаў “Іранскі дзённік”. Творчасць П.Панчанкі першага пасляваеннага дзесяцігоддзя. Паглыбленне эстэтычных і сацыяльна-філасофскіх асноў лірыкі паэта, увага да маральна-этычных праблем часу (зборнік “Кніга вандраванняў і любові”). Публіцыстычна-сатырычная скіраванасць творчасці паэта ў другой палове 1950–1960-х гг. Зборнік “Пры святле маланак” (1966) – этапная кніга П.Панчанкі. Шырокі ахоп з’яў рэчаіснасці, глыбокі філасофскі роздум і жанравая разнастайнасць лірыкі паэта (зборнікі “Крык сойкі”, 1976, “Дзе начуе жаўранак”, 1983, “Неспакой”, 1988, “Мы з тых беларусаў”, 1990, “Выбранае”, 1993). Засяроджанасць паэзіі П.Панчанкі 1980–1990-х гг. на духоўных каштоўнасцях чалавечага жыцця. Гуманістычны пафас і спавядальныя матывы ў зборніку “І вера, і вернасць, і вечнасць…”. Значэнне наватарскіх пошукаў П.Панчанкі ў галіне рытмікі і стылістыкі верша. Жыццёвая пазіцыя П.Панчанкі ў гісторыі беларускай літаратуры.

### *Тэма 17. Беларуская “ваенна-вясковая” школа ў прозе*

*Іван Мележ* (1921–1976). Першы зборнік прозы “У завіруху” (1946). Аповесць “Гарачы жнівень” (1946) – страты і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУИР

здабыткі. Атмасфера жыцця даваеннай беларускай вёскі. Раман “Мінскі напрамак” (1947–1952) – паказ падпольнай і партызанскай барацьбы ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Пошукі новых тэм і герояў у першай палове 1950-х гг. Праблемы маралі, духоўнасці чалавека (апавяданні “Дом пад сонцам”, “Спатканне за горадам”, “У гарах дажджы” і інш.). П’есы “Пакуль маладыя” (1955), “Дні нараджэння” (1957). “Палеская хроніка” І.Мележа – раманы “Людзі на балоце” (1960), “Подых навальніцы” (1965), “Завеі, снежань” (1976). Тэматыка і праблематыка. Шматпланавае эпічнае адлюстраванне жыцця беларускай вёскі 1920-х гг., лёсу народа ў пераломны перыяд гісторыі, стварэнне яркіх індывідуальных характараў. Кніга артыкулаў і публіцыстычных выступленняў І.Мележа “Жыццёвыя клопаты” (1975).

*Васіль Быкаў* (1924–2003). Асуджэнне вайны ў ранніх апавяданнях “У той дзень”, “Смерць чалавека”, “Абознік”, “Загад”, “Незагойная рана”. Гістарычна праўдзівае адлюстраванне падзей і духоўнага вобліку радавога ўдзельніка вайны ў аповесцях “Жураўліны крык” (1959), “Здрада” (1960), “Трэцяя ракета” (1961). Паэтызацыя подзвігу ў аповесці “Альпійская балада” (1963). Мастацкія пошукі В.Быкава ў другой палове 1960-х гг. Аповесці “Мёртвым не баліць”, “Праклятая вышыня”, “Круглянскі мост”. Цікавасць В.Быкава да партызанскай і падпольнай барацьбы” (“Сотнікаў”, “Абеліск”, 1971, “Воўчая зграя”, 1974, “Знак бяды”, 1982, “Кар’ер”, 1986 і інш.). Мастацка-філасофскае асэнсаванне разбурэння асноў народнага жыцця ў аповесцях “Аблава”, “Сцюжа”. Айчынная гісторыя ў апавяданнях “На чырвоных лядах”, “Перад канцом”, “Жоўты пясочак”, “Чырвоныя пятліцы”. Тэматычная навізна твораў ваеннай тэматыкі (“Пакахай мяне, салдацік”, “Балота”, апавяданні “Палкаводзец”, “Палітрук Каламіец”, “Кацюша”, “Пагорак” і інш.). Адлюстраванне праблем сучаснасці (“Ваўчыная яма”). Апавяданні-прыпавесці В.Быкава (“Ідэя”, “Труба”, “Камень”, “Свіст”, “Тры словы нямога”, “Кошка і мышка” і інш.). Кнігі апавяданняў “Сцяна” (1997), успамінаў “Доўгая дарога дадому” і публіцыстыкі “Крыжовы шлях”. Традыцыі і наватарства ў творчасці В.Быкава. Крытычныя і літаратуразнаўчыя працы пра жыццё і творчасць пісьменніка. Экранізацыя яго твораў (“Жураўліны крык”, “Здрада”, “Трэцяя ракета”, “Пастка”,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“Альпійская балада”, “Праклятая вышыня”, “Сотнікаў”, “Абеліск”, “Дажыць да світання”, “Воўчая зграя”, “Знак бяды”). Роля В.Быкава ў духоўна-маральным жыцці грамадства.

*Іван Шамякін* (1921–2004). Раннія творы на тэму Вялікай Айчыннай вайны (апавяданне “У снежнай пустыні”, аповесць “Помста”). Раманы “Глыбокая плынь”, “У добры час”, “Крыніцы”, іх змест і праблематыка. Пенталогія “Трывожнае шчасце” – твор пра пакаленне равеснікаў пісьменніка. Раманы “Сэрца на далоні”, “Атланты і карыятыды”. Ідэйны змест і праблематыка. Тэматыка і мастацкія асаблівасці драматычных твораў “Не верце цішыні”, “Выгнанне блудніцы”, “Дзеці аднаго дома”, “І змоўклі птушкі”. Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў творах “Шлюбная ноч”, “Гандлярка і паэт”. Маральна-этычныя праблемы ў раманах “Вазьму твой боль”, “Зеніт”. Гістарычныя раманы “Петраград – Брэст”, “Вялікая княгіня”. Праблемы сучаснасці ў творах “Злая зорка”, “Сатанінскі тур”, “Губернатар”.

*Іван Навуменка* (1925–2006). Звесткі аб жыцці і творчасці. Трылогія “Сасна пры дарозе”, “Вецер у соснах”, “Сорак трэці”. Гераічнае і трагічнае, аўтабіяграфічнасць твораў. Маральна-этычная праблематыка аповесцей “Інтэрнат на Нямізе”, “Дзяцінства”, “Юнацтва”, “Падлетак” і інш. Літаратуразнаўчая дзейнасць пісьменніка. *Вячаслаў Адамчык* (1933–2001). Празаічная тэтралогія (“Чужая бацькаўшчына”, “Год нулявы”, “І скажа той, хто народзіцца”, “Голас крыві брата твайго”). Нацыянальнае і сацыяльнае, традыцыі і наватарства, жанрава-стылістычныя і вобразна-выяўленчыя асаблівасці прозы В.Адамчыка. *Віктар Казько* (нар. у 1940). Аповесць “Суд у Слабадзе”, раманы “Неруш”, “Хроніка дзетдомаўскага саду”, аповесць “Выратуй і памілуй нас, чорны бусел”, раман “Бунт незапатрабаванага праху” – праблематыка, жанрава-стылістычныя асаблівасці. Проза В.Казько і традыцыі еўрапейскай літаратуры. *Міхась Стральцоў* (1937–1987). Разнапланавасць творчых інтарэсаў. Зборнікі прозы “Блакітны вецер”, “Сена на асфальце”. Стылявая адметнасць, імпрэсіяністычнасць творчай манеры. Паэтычныя кнігі “Ядлоўцавы куст”, “Цень ад вясла”, “Мой свеце ясны”. Традыцыі і наватарства ў творчасці пісьменніка. *Іван Чыгрынаў* (1934–1996). І.Чыгрынаў-апавядальнік. Пенталогія (раманы “Плач перапёлкі”, “Апраўданне крыві”, “Свае і чужынцы”, “Вяр-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

танне да віны”, “Не ўсе мы згінем”). Праблематыка, вобразы твораў. Ідэйна-мастацкая і грамадзянская эвалюцыя светапогляду пісьменніка ў заключных раманах пенталогії. *Анатоль Кудравец* (нар. у 1936). Аповесць “Раданіца”, раман “Сачыненне на вольную тэму” – псіхалагізм у паказе жыцця беларускай вёскі. Навізна праблематыкі апавяданняў 1990-х гг. (“Ігнат Сцяпанавіч Вапшчэткі”, “Баёк”, “Бацька“ і інш.). *Віктар Карамазаў* (нар. у 1934). Раман “Пушча”– праблема ўзаемаадносін чалавека і прыроды. Аўтабіяграфічная аснова рамана “Бежанцы”.  Мастацка-біяграфічная аповесць “Крыж на зямлі і поўня ў небе”. *Іван Пташнікаў* (нар. у 1932). Аповесці “Тартак”, “Найдорф”, раман “Алімпіяда”. Малюнкава-аналітычны прынцып адлюстравання рэчаіснасці, паяднанне вопыту нацыянальнай і сусветнай прозы.

### *Тэма 18. Лірычная і гістарычная проза, драматургія*

*Янка Брыль* (1917–2006). Адлюстраванне заходнебеларускай рэчаіснасці ў ранніх творах (“Марыля”, “Праведнікі і зладзеі”, “Сірочы хлеб” і інш.). Майстэрства Брыля-апавядальніка. Маральна-этычная праблематыка апавяданняў “Галя”, “Адзін дзень”, “Казачок”. Аповесць “Апошняя сустрэча” – паглыбленне псіхалагізму і аналітычнасці. Раман Я.Брыля “Птушкі і гнёзды”. Гісторыя стварэння, аўтабіяграфічныя элементы. Тэма Бацькаўшчыны. Вобраз Алеся Руневіча. Навізна праблематыкі. Мастацка-выяўленчыя сродкі твора. Аналітычнасць, лірызм і філасафічнасць твора. Аповесць “Ніжнія Байдуны” – разнавіднасці смеху і іх адлюстраванне ў творы. Выяўленчае майстэрства пісьменніка ў аповесці “Золак, убачаны здалёк”. Жанр міні-прозы ў творчасці Я.Брыля, яго сувязь з дзённікавымі запісамі. Сродкі стварэння мастацкага вобраза ў “малой прозе”. Тэматычная разнастайнасць і эстэтычная арыгінальнасць мініяцюр з кніг “Жменя сонечных промняў”, “Вітраж”, “На сцежцы – дзеці” і інш. Трагізм чалавечага лёсу ў аповесці “Муштук і папка”. Аўтабіяграфічная аснова твора.

*Уладзімір Караткевіч* (1930–1994). Рознабаковасць таленту (паэзія, проза, драматургія, эсэістыка). Зборнікі паэзіі “Матчына душа”, “Вячэрнія ветразі”, “Мая Іліяда”, “Быў. Ёсць. Буду.”. У.Караткевіч-празаік. Гістарычнае мінулае і су-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

часнасць у раманах “Нельга забыць”, “Хрыстос прызямліўся ў Гародні”, “Чорны замак Альшанскі”, аповесці “Дзікае паляванне караля Стаха”. Разнастайнасць характараў, драматызм адносін, прыгодніцка-рамантычная аснова ў творах. Раман “Каласы пад сярпом тваім” – шматпланавае палатно пра падрыхтоўку паўстання 1863 г. на Беларусі. Выкрывальніцкі пафас аповесці “Зброя”. Паэма ў прозе “Чазенія”. Філасофская праблематыка аповесці “Ладдзя роспачы”. Майстэрства У.Караткевіча-апавядальніка (“Вока тайфуна”, “Кніганошы”, “Краіна цыганія” і інш.). Патрыятычны пафас нарысаў-эсэ пісьменніка (“Зямля пад белымі крыламі”, “Белавежская пушча”). У.Караткевіч-драматург (“Званы Віцебска”, “Маці Урагану”, “Кастусь Каліноўскі”, “Млын на Сініх Вірах”, “Калыска чатырох чараўніц”). Роля У.Караткевіча ў гісторыі беларускай літаратуры.

Сцэнічны поспех п’ес А.Макаёнка, К.Крапівы. Надзённасць п’ес *М.Матукоўскага* (1929–2001) (“Амністыя”, “Апошняя інстанцыя”), *І.Козела* (“Папараць-кветка”, “Над хвалямі Серабранкі”). *Алесь Петрашкевіч* (нар. у 1930). Маральна-этычная праблематыка п’ес “Трывога”, “Соль”, “Злыдзень”, “Укралі кодэкс”. Зварот да гісторыі на пачатку 1980–1990-х гг. (“Напісанае застаецца”, “Змова”, “Мой друг – Вялікі Чалавек”). Чарнобыльская тэматыка (“Дагарэла свечачка”, “Інтэрнацыянал па-беларуску”). *А.Дудараў* (нар. у 1950). П’еса “Радавыя” – паказ вайны вачыма пасляваеннага пакалення. Беларуская гісторыя ў п’есах “Купала”, “Чорная панна Нясвіжа”.

*Андрэй Макаёнак* (1920–1983). Раннія п’есы-аднаактоўкі “Перад сустрэчай”, “Жыццё патрабуе”, “Крымінальная справа”, драма “На досвітку”. Камедыя “Выбачайце, калі ласка!”. Гуманістычны пафас. Асуджэнне бюракратызму, ашуканства, кар’ерызму. Камедыі “Лявоніха на арбіце”, “Каб людзі не журыліся”. Пошукі новага жанру. Палітычная трагікамедыя “Зацюканы апостал”. Канфлікт, інтрыга і сюжэт камедыі. Майстэрства А.Макаёнка-камедыёграфа. Гратэск, шарж, пераўвасабленне як прыёмы тыпізацыі. Роля аўтарскага каментарыя ў п’есе. Элементы лубка і фарсу ў мастацкай структуры трагікамедыі “Трыбунал”.

Паказ сацыяльна-псіхалагічных праблем жыцця ў камедыях “Таблетку пад язык”, “Святая прастата”, “Пагарэльцы”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 19. “Філалагічнае” пакаленне ў беларускай паэзіі*

*Ніл Гілевіч* (нар. у 1931). Паэтычныя зборнікі “Актавы”, “Жыта, сосны і валуны”, “Талісман”, “Ёсць зямля такая”. Грамадзянскі пафас, бескампраміснасць, мяккі лірызм, жанравая разнастайнасць твораў. Раман у вершах “Родныя дзеці”. Паэмы “Сто вузлоў памяці”, “А дзе ж тая крынічанька…”, “Лодачкі”. *Рыгор Барадулін* (нар. у 1935). Зборнікі паэзіі “Нагбом”, “Неруш”, “Свята пчалы”, “Евангелле ад мамы”, “Самота паломніцтва”, “Ксты”. Адметнасць барадулінскага метафарызму. Майстэрства Р.Барадуліна-перакладчыка. *Васіль Зуёнак* (нар. у 1935). Асноўныя матывы лірыкі. Паэмы “Сяліба”, “Маўчанне травы”, “Падарожжа вакол двара”. Мастацкае даследаванне быцця і маралі народа. Касмізм і гуманістычная сутнасць мыслення. *Анатоль Вярцінскі* (нар. у 1931). Гуманістычны пафас і грамадзянскае гучанне лірыкі. Зборнікі “Тры цішыні”, “Чалавечы знак”, “Жанчына. Мужчына. Каханне” і інш. Своеасаблівасць паэтычнай манеры. Паэмы “Дажынкі”, “Заазер’е”, “Колькі лет, колькі зім”. Праблематыка і асаблівасці вобразна-выяўленчай палітры. *Генадзь Бураўкін* (нар. у 1936). Зборнікі “Жніво”, “Пяшчота”, “Узмах крыла”. Асаблівасці паэтычнага выказвання. Грамадзянскасць і лірызм. Роздумна-спавядальныя матывы, гістарычная тэматыка, пейзажная лірыка. Жанрава-стылявая адметнасць паэмы “Хатынскі снег”. *Янка Сіпакоў* (нар. у 1936). Кніга “Веча славянскіх балад” і яе значэнне ў гісторыі беларускай літаратуры. Паэма “Одзіум” – вобразна-выяўленчыя сродкі, праблематыка. Жанрава-стылявая адметнасць прозы Я.Сіпакова. Кнігі “Жанчына сярод мужчын”, “Тыя, што ідуць” і інш.

*Алесь Разанаў* (нар. у 1947). Зборнікі “Каардынаты быцця”, “Шлях – 360”, “У горадзе валадарыць Рагвалод”, “Рэчаіснасць” і інш. Інтэлектуальная насычанасць. Узбагачэнне беларускай паэзіі новымі жанравымі формамі (квантэмы, вершаказы, версэты). Паэзія як спосаб самапазнання, зашыфраванасць і метафарычнасць вобразаў. *Яўгенія Янішчыц* (1948–1988). Адметнасць паэтычных зборнікаў “Снежныя грамніцы”, “Дзень вечаровы”, “Ясельда”, “На беразе пляча”, “Каліна зімы”. Асаблівасці інтымнай лірыкі: эмацыянальнасць, задушэўнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Тэма 20. Беларуская літаратура на сучасным этапе*

Агульная характарыстыка сацыяльна-грамадскіх абставін. Узнікненне літаратурных суполак “Тутэйшыя”, “ТВЛ”, “Бум-Бам-Літ”, “Шмэрцвэрк” і інш., новых літаратурна-філасофскіх выданняў “Крыніца”, “Зно”, “Дзеяслоў”, “Arche”, аднаўленне “Нашай Нівы”.

*Паэзія*. Праблема традыцый і наватарства. Эстэтычна-стылявыя плыні: лірыка-апавядальная, рамантычная, публіцыстычная, філасофска-аналітычная, мастацка-сінкрэтычная, універсальна-інтэлектуальная (Л.Дранько-Майсюк, А.Бадак, Л.Рублеўская, А.Чобат, Э.Акулін, А.Хадановіч, В.Морт і інш.). *Анатоль Сыс* (1959–2005). Кніга “Лён”. Змест, вобразна-выяўленчыя асаблівасці паэзіі. *Алесь Пісьмянкоў* (1957–2004). Кніга “Я не памру, пакуль люблю…” – гуманістычны пафас.

*Проза*. Філасофска-эстэтычная эвалюцыя прозы 1990-х – пачатку XXI ст. Тэматычныя і жанрава-стылявыя кірункі. Традыцыйныя гуманістычныя каштоўнасці ў творах Х.Лялько, Г.Багданавай, У.Ягоўдзіка і інш. Тэма гістарычнага мінулага ў творчасці Л.Дайнекі, У.Арлова, В.Іпатавай, К.Тарасава, В.Чаропкі. Пашырэнне жанравых формаў, жанравая інтэграцыя. Тэндэнцыі постмадэрнізму і іх выяўленне ў творчасці Ю.Станкевіча (“Любіць ноч – права пацукоў”, “Бесапатам”), В.Гігевіча (“Пабакі”, “Карабель”, “Прыгоды Базыля Беларуса”), А.Федарэнкі (“Нічые”, “Рэвізія”), А.Наварыча (“Прыгоды Рабунькі”, “Літоўскі воўк”). Фармальна-стылявыя пошукі і эксперыменты ў прозе А.Асташонка, А.Глобуса, П.Васючэнкі, У.Сцяпана, Б.Пятровіча. Своеасаблівасць творчай манеры А.Бахарэвіча (кніга “Ніякай літасьці Валянціне Г.”), С.Балахонава (“Імя грушы”), Югасі Каляды (“Галоўная памылка Афанасія”).

*Драматургія*. Пошук новых жанравых формаў, арыентацыя на творчы эксперымент. Шляхі абнаўлення паэтыкі ў драматургіі “новай хвалі”. Творы У.Бутрамеева, А.Асташонка, І.Сідарука, У.Сауліча, М.Адамчыка, Ю.Станкевіча і інш. Герменеўтычная драматургія С.Кавалёва (п’есы “Стомлены д’ябал”, “Тарас на Парнасе”).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


*Гісторыя* беларускай літаратуры XIX – пачатку XX ст.: падруч. для філал. спецыяльнасцей выш. пед. навуч. устаноў / І.Э.Багдановіч, У.В.Гніламёдаў, Л.С.Голубева [і інш.]. – 2-е выд., дапрац. – Мінск: Выш. шк., 1998. – 559 с.

*Гісторыя* беларускай літаратуры: XX стагоддзе (1920–1950-я гг.): падруч. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей ВНУ / У.В.Гніламёдаў, В.В.Казлова, М.А.Лазарук [і інш.]. – 4-е выд., дапрац. і дап.; пад агульн. рэд. М.А.Лазарука, А.А.Семяновіча. – Мінск: Выш. шк., 1998. – 315 с.

*Гісторыя* беларускай літаратуры: старажытны перыяд: падруч. для філал. спецыяльнасцей пед. ВНУ / М.М.Грынчык, У.А.Калеснік, У.Г.Кароткі [і інш.]. – 4-е выд., стэрэатып. – Мінск: Выш. шк., 1998. – 349 с.

*Гісторыя* беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў: у 2 т. / НАНБ, Ін-т літ-ры імя Я.Купалы; навук. рэд. В.А.Чамярыцкі. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2006. – 910 с.

*Гісторыя* беларускай літаратуры XX ст.: у 4 т. / НАНБ, Ін-т літ-ры імя Я.Купалы; рэдкал.: У.В.Гніламёдаў [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 1999–2003. – Т. 1. – 583 с.; Т. 2. – 903 с.; Т. 3. – 952 с.; Т. 4. – 975 с.

*Лойка, А.А.* Гісторыя беларускай літаратуры: дакастрычніцкі перыяд: у 2 ч. / А.А.Лойка. – Мінск: Маст. літ., 1988–1989. – Ч. 1. – 299 с.; Ч. 2. – 437 с.


*Дадатковая*


*Адамовіч, А.* Браму скарбаў сваіх адчыняю…: даследаванне жыцця і творчасці М. Гарэцкага / А.Адамовіч. – Мінск: БДУ, 1980. – 223 с.

*Анталогія* даўняй беларускай літаратуры / пад рэд. В.Чамярыцкага. – Мінск: Выш. шк., 2003. – 1015 с.

*Арочка, М.М.* Максім Танк: жыццё ў паэзіі / М.М.Арочка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1984. – 270 с.

*Афанасьеў, І.М.* Чарнобыльскае светаадчуванне ў сучаснай беларускай літаратуры / І.М.Афанасьеў. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – 128 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Баршчэўскі, Л.* Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён: папулярныя нарысы / Л.Баршчэўскі, П.Васючэнка, М.Тычына. – Мінск: Радыёла–плюс, 2006. – 574 с.

*Беларуская* літаратура XIX ст.: хрэстаматыя / склад. і аўт. камент. А.А.Лойка, В.П.Рагойша. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск: Выш. шк., 1988. – 487 с.

*Беларуская* літаратура XIX–пачатку XX ст.: хрэстаматыя / аўт. уступ. арт. У.М.Казбярук. – Мінск: Нар. асвета, 1977. – 191 с.

*Беларускія* пісьменнікі: бібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / Ін-т літ-ры імя Я.Купалы АН РБ; рэдкал.: І.Э.Багдановіч [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1992–1995. – Т. 1. – 542 с.

*Бечык, В.Л.* Прад высокаю красою: літ.-крыт.арт. / В.Л.Бечык. – Мінск: Маст. літ., 1984. – 154 с.

*Бугаёў, Дз.* Уладзімір Дубоўка: кніга пра паэта / Дз.Бугаёў. – Мінск: Беларус. навука, 2005. – 322 с.

*Васючэнка, П.В.* Сучасная беларуская драматургія: дапам. для настаўнікаў / П.В.Васючэнка. – Мінск: Маст. літ., 2000. – 156 с.

*Верабей, А.Л.* Уладзімір Караткевіч: жыццё і творчасць / А.Л.Верабей. – 2-е выд., дапрац. і выпр. – Мінск: Беларус. навука, 2005. – 269 с.

*Гніламёдаў, У.В.* Янка Купала: жыццё і творчасць / У.В.Гніламёдаў. – Мінск: Беларус. навука, 2002. – 237 с.

*Дедков, И.А.* Василь Быков: повесть о человеке, который выстоял / И.А.Дедков. – М.: Сов. писатель, 1990. – 187 с.

*Жураўлёў, В.П.* Якуб Колас і паэтыка беларускага рамана / В.П.Жураўлёў. – 2-е выд., выпр. і дап. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – 204 с.

*Калеснік, У.А.* Тварэнне легенды / У.А.Калеснік. – Мінск: Маст. літ.,1987. – 431 с.

*Кісялёў, Г.* Ад Чачота да Багушэвіча / Г.Кісялёў. – 2-е выд. – Мінск: Маст. літ., 2003. – 426 с.

*Колас, Г.Д.* Карані міфаў: жыццё і творчасць Я.Купалы / Г.Д.Колас. – Мінск: БГАКЦ, 1998. – 346 с.

*Корань, Л.Д.* Цукровы пеўнік: літ.-крыт. арт. / Л.Д.Корань. – Мінск: Маст. літ., 1996. – 286 с.

*Лазарук, М.А.* Пімен Панчанка: літ.-крыт. нарыс / М.А.Лазарук. – Мінск: Дзяржаўнае выдавецтва БССР, рэдакцыя мастацкай літаратуры, 1959. – 125 с.

*Лаўшук, С.С.* Кандрат Крапіва і беларуская драматургія / С.С.Лаўшук. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2002. – 250 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Мальдзіс, А.І.* Падарожжа ў XIX ст. / А.І.Мальдзіс. – Мінск: Маст. літ., 1969. – 206 с.

*Мальдзіс, А.І.* Таямніцы старажытных сховішчаў / А.І.Мальдзіс. – Мінск: Маст. літ., 1974. – 176 с.

*Мушынскі, М.І.* Праўдзівая гісторыя жыцця і творчасці Міхася Зарэцкага / М.І.Мушынскі. – 2-е выд., дап. – Мінск: Беларус. навука, 2005. – 338 с.

*Навуменка, І.Я.* Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч / І.Я.Навуменка. – Мінск: Беларус. навука, 1992. – 216 с.

*Навуменка, І.Я.* Змітрок Бядуля / І.Я.Навуменка. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – 226 с.

*Навуменка, І.Я.* Максім Багдановіч / І.Я.Навуменка. – Мінск: Беларус. навука, 1997. – 141 с.

*Пачынальнікі*. З гісторыка-літаратурных матэрыялаў XIX ст. / АН БССР, Ін-т літ-ры імя Я.Купалы; уклад. Г.В.Кісялёў, рэд. В.В.Барысенка, А.І. Мальдзіс. – Мінск: Навука і тэхніка, 1977. – 543 с.

*Пяцьдзесят* чатыры дарогі: аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў / склад. і падрыхт. тэксту Я.Казекі. – Мінск: Дзяржвыд. БССР, 1963. – 551 с.

*Саверчанка, І.В.* Старажытная паэзія Беларусі / І.В.Саверчанка. – Мінск: Беларус. навука, 1992. – 254 с.

*Савік, Л.С.* Пакліканыя. Літаратура беларускага замежжа / Л.С.Савік. – Мінск: Тэхналогія, 2001. – 479 с.

*Тычына, М.А.* Карані і крона: фальклор і літаратура / М.А.Тычына. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2002. – 195 с.

*Францыск* Скарына: зборнік дакументаў і матэрыялаў / рэд. Я.Д.Ісаевіч, В.А.Чамярыцкі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1988. – 349 с.

*Хаустовіч, М.* На парозе забытае святыні: творчасць Яна Баршчэўскага / М.Хаустовіч. – Мінск: Беларус. навука, 2002. – 151 с.

*Хрэстаматыя* па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі: у 3 т. / Бел. ун-т культуры; уклад., рэд. тэкстаў, уступ. арт. і камент. А.В.Сабалеўскага. – Мінск: Беларус. навука, 1997. – 444 с.

*Цвірка, К.А.* Камяні тых сядзібаў: шляхі паэтаў XIX стагоддзя / К.А.Цвірка. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 2004. – 300 с.

*Янка Купала*: энцыкл. даведнік / рэдкал.: П.І.Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1986. – 727 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**БЕЛАРУСКАЯ І СУСВЕТНАЯ ЛІТАРАТУРА**
**Раздзел І. БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА**

**Тыпавая вучэбная праграма**
для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці
1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках)


Карэктар В.Б.Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л.М.Мельнік

Падпісана ў друк 2011 г. Фармат $60 \times 84^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 1,63. Ул.-выд. арк. 1,24.
Тыраж экз. Заказ .

УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў".
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.
Ліцэнзія № 02330/0003939 ад 19.05.2011 г.

Надрукавана на рызографе
УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў".
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ